**[«Прафесійны** ваенны»] // Голас Сенненшчыны. — 1992. — 15 жн. — С. 2.



«Прафесійны ваенны» – прадставіўся пры сустрэчы Сяргей Іванавіч Дзябольскі. Ён нарадзіўся ў сям'і ваенных. І дзед, і бацька верна служылі Айчыне.

– Так што, «мой адрас – Савецкі Саюз», сказаў бы я яшчэ год таму назад. А зараз нават не ведаю, як адрэкамендавацца. Вось ужо шосты год працую ў Сенненскім райваенкамаце. Аднак прысягу на вернасць Рэспублíцы Беларусь не даваў. Хаця, ці ў гэтым справа? Аднойчы я ўжо прысягаў, у тым ліку і Беларусі. Дык ці трэба зноў рабіць гэта? – разважае Сяргей Іванавіч.

У Савецкай Арміі Дзябольскі служыў у ваенна-паветраных войсках, у фарміраваннях спецыяльнага прызначэння. Некалькі гадоў правёў у Афганістане. Менавіта адтуль пасля цяжкага ранення прыехаў у Сянно маёр Дзябольскі. Нягледзячы на льготы, прадастаўленныя дзяржавай, год жыў адзін, без сям'і, бо кватэру адразу не выдзелілі. Але ён не ў крыўдзе на ўладу, бо добра разумее тыя цяжкасці, з якімі мы зараз сутыкнуліся. Сваім калегам, тым, каму таксама давялося ваяваць ў Афганістане ці яшчэ дзе, выконваючы загад урада, ён таксама імкнецца давесці гэта разуменне.

– Жыллёвая праблема адна з вастрэйшых сёння ў Беларусі. У нас практычна кожны чацвёрты мае права на нечарговае або першачарговае атрыманне кватэры. Гэта і інваліды, і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, і «афганцы», і сем'і загінуўшых, і пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і маладыя спецыялісты, і гэтак далей, і таму падобнае. Ну каго тут надзяліць жыллём?

І ў гэтых словах Дзябольскага ёсць рацыя.

Скупы на словы, нетаропкі ў вывадах, Дзябольскі не любіць гаварыць пра Афганістан. Аднак нават з той кароткай размовы, што адбылася ў нас, можна было заўважыць, што тыя метамарфозы, якія адбыліся ў нашым грамадстве, у адносінах да ўдзельнікаў вайны ў гэтай краіне, у тым ліку ў многім з падачы сродкаў масавай інфармацыі, ён успрымае балюча. Кім у нашым успрыманні не былі б гэтыя людзі, мы называлі іх воінамі-інтэрнацыяналістамі, выратавальнікамі рэвалюцыі, надзеяй перабудовы, ахвярамі камуністычнага таталітарнага рэжыму. У апошні час дзе-нідзе іх, учарашніх школьнікаў, імкнуцца прадставіць гэткімі цынічнымі забойцамі. Спыніцеся, апамятайцеся. Ці маем мы права меркаваць аб тым, аб чым не маем ніякага ўяўлення? Наколькі трэба дэградзіраваць грамадству, каб васемнаццацігадовых юнакоў, з матчыным малаком на вуснах, кінутых у пекла жорсткай вайны, сёння выстаўляць вось у такім свеце? Дайце, нарэшце, спакою іх знявечаным душам.

Не маем мы маральнага права папракнуць і тых, для каго вайна – работа. Асабліва, калі ўспомнім аб тым, якімі мы былі тады, якім багам маліліся.

Які ж ён, маёр Дзябольскі, чалавек, прайшоўшы ваду, агонь…? За час, які ён працуе ў раёне, таварышы па службе высока адзываюцца аб яго чалавечых і прафесійных якасцях. Нядаўна яго партрэт змешчаны на раённы Стэнд гонару.

На здымку: маёр Дзябольскі

Фота У. Мірзы